КАРАЛЕЎСКІЯ ТАЯМНІЦЫ ГАРОДНІ

Мала хто ведае, што самае «каралеўскае» схавана ў Гродне ад вачэй. Нібы прыгожыя таямніцы, вабяць да сябе тры сядзібы Станіслава Аўгуста Панятоўскага, апошняга караля Рэчы Паспалітай. Яны размешчаны ў трох розных частках горада, а знайсці іх не так лёгка. Манарх часта пакідаў палац, паляваў, хацеў забаўляцца і адпачываць, таму сядзібы карысталіся папулярнасцю. Іх будавалі па праектах прыдворнага архітэктара Джузэпэ дэ Сака, спраектаваныя будынкі якога можна знайсці акрамя Гродна яшчэ ў Шчорсах і Паставах.

Кароль Станіслаў II Кшыштаф Юзэф Вернер

Адрэканструяваная сядзіба Станіслава замаскіравана пад корпус Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта і з'яўляецца адзіным з трох уладанняў былога караля, якое эксплуатуецца. Дж. дэ Сака натхняўся італьянскімі матывамі і своеасаблівасцю італьянскай будаўнічай школы, таму Станіславова вытрымана ў стылі барока і вылучаецца смарагдавай (ярка-зялёнай) расфарбоўкай. Трапіць унутр пакуль немагчыма, але дзеля атрымання асалоды дастаткова прайсціся па ўнутраным двары. Вакол сядзібы размясціўся чароўны сад з рэдкімі для беларускай флоры гатункамі дрэваў, а да ўязной брамы вядзе дарога, уздоўж якой узвышаюцца ліпы часоў праўлення Станіслава Аўгуста Панятоўскага.



Карціна Н. Орды «Сядзіба Станіславова»

Сядзіба Станіславова ў нашы дні



Возера Аўгустова на Google тар

Непрыкметнае на першы погляд Аўгустова амаль што не захавалася. Яго рэшткі, непрыкметныя сярод жылых шматкватэрных дамоў, раскінуліся на вялікую адлегласць уздоўж цяперашняй вуліцы Рэпіна. Галоўны будынак, у архітэктуры якога спалучаліся класіцызм і барока, згарэў падчас Першай сусветнай вайны. Зразумела, што каралеўскі маёнтак меў усе належныя прыкрасы. Стаіць карчма, у мінулым стагоддзі перабудаваная апошнімі ўладальнікамі ў асабістую рэзідэнцыю, а ў наш час адноўленая для выкарыстання. Возера, якое ўпрыгожвала Аўгустова, і фрагмент алеі таксама з цягам часу змяніліся. Дзякуючы мастакам і гісторыкам атрымалася знайсці месца, на якім стаяў галоўны будынак, два флігелі і ўязная брама. На фотаздымках, зробленых з космасу, можна заўважыць прыблізнае месцазнаходжанне ўсіх аб'ектаў, а Google Maps дазваляе паглядзець возера ў рэжыме панарамы. Захаваннем гісторыі сядзібы займаецца гімназія №4 горада Гродна.

Карчма сядзібы Аўгустова

Здаецца, самая рамантычная з сядзіб Панятоўскага — Панямунь. Назва, канешне, кажа сама за сябе. Вялікі будынак размясціўся на беразе Нёмана. Былы выгляд сядзібы, што ствараў з ракой маляўнічы альянс, уражваў і зачароўваў. У Першую сусветную вайну немцы нават фатаграфаваліся на верандзе дома.

Карціна Н. Орды «Панямунь»

Непрыкметнае на першы погляд Аўгустова амаль што не захавалася. Яго рэшткі, непрыкметныя сярод жылых шматкватэрных дамоў, раскінуліся на вялікую адлегласць уздоўж цяперашняй вуліцы Рэпіна. Галоўны будынак, у архітэктуры якога спалучаліся класіцызм і барока, згарэў падчас Першай сусветнай вайны. Зразумела, што каралеўскі маёнтак меў усе належныя прыкрасы. Стаіць карчма, у мінулым стагоддзі перабудаваная апошнімі ўладальнікамі ў асабістую рэзідэнцыю, а ў наш час адноўленая для выкарыстання. Возера, якое ўпрыгожвала Аўгустова, і фрагмент алеі таксама з цягам часу змяніліся. Дзякуючы мастакам і гісторыкам атрымалася знайсці месца, на якім стаяў галоўны будынак, два флігелі і ўязная брама. На фотаздымках, зробленых з космасу, можна заўважыць прыблізнае месцазнаходжанне ўсіх аб'ектаў, а Google Maps дазваляе паглядзець возера ў рэжыме панарамы. Захаваннем гісторыі сядзібы займаецца гімназія №4 горада Гродна.



Возера Аўгустова на Google тар

Здаецца, самая рамантычная з сядзіб Панятоўскага — Панямунь. Назва, канешне, кажа сама за сябе. Вялікі будынак размясціўся на беразе Нёмана. Былы выгляд сядзібы, што стваraў з ракой маляўнічы альянс, уражваў і зачароўваў. У Першую сусветную вайну немцы нават фатаграфаваліся на верандзе дома.

Карціна Н. Орды «Панямунь»



Карчма сядзібы Аўгустова